Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЯК ПРАВІЛЬНА ФАРМАВАЦЬ ПЕРАЦ

**Аб фармаванні кустоў варта задумацца яшчэ на этапе высадкі расады: схема пасадкі перцу ў цяпліцы можа сур'ёзна паўплываць на гэты працэс. Акрамя таго, пажадана прадумаць канструкцыю шпалераў для высакарослых сартоў, у якіх кожная шкілетная галінка падвязваецца асобна.**

## ЭТАП ПЕРШЫ — ВЫДАЛЕННЕ КАРОННАГА БУТОНА

Да пэўнага моманту перац расце ў адно сцябло, але пры дасягненні вышыні 15—20 см (у залежнасці ад сорту) пачынае разгалінаўвацца, утвараючы некалькі галін. На месцы разгалінавання фарміруецца першы кветкавы бутон, які называюць каронным.

Яго для лепшага галінавання і развіцця куста варта выдаліць.

## ЭТАП ДРУГІ — ВЫДАЛЕННЕ ЛІШНІХ ПАРАСТКАЎ

Часцей за ўсё расліны фармуюць у дзве-тры галінкі, пакідаючы наймацнейшыя з тых, якія сфарміраваліся са скрыжавання з каронным бутонам. Астатнія прышчыпваюць — гэта значыць, абразаюць пункт росту, верхавіну.

Як правіла, да згаданага моманту на кусце ўтворыцца ўжо 10—12 лістоў. Астатнія галінкі першага парадку называюць шкілетнымі, яны і будуць складаць куст.

Шкілетныя галінкі неўзабаве пачынаюць галінавацца гэтак жа, як асноўнае сцябло, утвараючы «відэльчык», у цэнтры якога фарміруецца бутон.

З такімі разгалінаваннямі паступаем аналагічна: пакідаем наймацнейшую, а слабая прышчыпваем вышэй ад кветкавай пупышкі і першага ліста.

**Для даведкі.** Пакідаць адзін ліст на галінках, якія выдаляюцца, трэба абавязкова, бо ён сілкуе размешчаную пад ім завязь будучага плода.

З кожным наступным разгалінаваннем паступаем гэтак жа, прышчыпваючы слабыя галінкі над першым лістком.




На кожным разгалінаванні з'яўляцца кветкавыя бутоны, а пасля — завязі. Іх пакідаюць, а тыя, што вырастаюць у міжвузеллі, выдаляюць. Усяго на адным кусце дастаткова пакінуць 15—25 пладоў.

## ЭТАП ТРЭЦІ — ВЫДАЛЕННЕ БЯСПЛОДНЫХ ГАЛІНАК І НІЖНІХ ЛІСТОЎ

Варта перыядычна аглядаць куст і выяўляць бясплодныя галінкі, выдаляючы іх. Яны ўтворацца ніжэй ад таго месца, дзе разгалінуецца галоўнае сцябло.

Там жа варта выдаляць і лісты, якія ніяк не ўдзельнічаюць у сілкаванні завязяў, але зацяняюць пасадкі і высмоктваюць з расліны сокі.

**Парада.** Адначасова з такім мерапрыемствам выдаляйце з куста пашкоджаныя і хворыя лісты, дзе б яны ні раслі. Цана пытання — здароўе ўсёй расліны.

Важна памятаць, што ўтварэнне завязяў, рост і пасяванне пладоў залежаць у першую чаргу ад асвятлення. Калі расліне бракуе святла, нават пры багатым цвіценні плады могуць не завязацца.

Таму па меры росту трэба будзе абразаць усё лішняе лісце.

Лісце на асноўным сцябле абразаюць, калі плод з першага разгалінавання дасягне тэхнічнай спеласці (адпаведнага сорту памеру і формы).

Калі вырастуць плады на другім разгалінаванні, выдаляюць лісты, размешчаныя пад ім.

**Увага!** За адзін раз можна зразаць не больш за два лісты!

Аналагічна паступаюць з лістамі пад усімі астатнімі пладамі, якія спеюць. Але апошняе выдаленне трэба зрабіць прыкладна за паўтара месяца да заканчэння сезона і канчатковай уборкі ўраджаю. На гэты час расліну варта пакінуць у спакоі.

## ЭТАП ЧАЦВЁРТЫ — ПРЫШЧЫПКА ШКІЛЕТНЫХ ГАЛІН

Калі на кусце ўтварылася дастатковая колькасць пладоў, паскорыць іх рост дапамагае прышчыпванне пунктаў росту на асноўных галінах. Расліна перастае расці і траціць сілы на новыя завязі, поўнасцю накіроўваючы іх на ўжо існуючыя.

Гэты працэс таксама павінен быць ажыццёўлены за паўтара месяца да меркаванага заканчэння вырошчвання перцу.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.45 | 21.31 | 16.46 |
| Віцебск — | 4.27 | 21.28 | 17.01 |
| Магілёў — | 4.35 | 21.21 | 16.46 |
| Гомель — | 4.40 | 21.08 | 16.28 |
| Гродна — | 5.02 | 21.44 | 16.42 |
| Брэст — | 5.11 | 21.36 | 16.25 |

## Месяц

*Першая квадра 27 мая. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

*Пр. Дзмітрыя, Івана, Ігната, Карнілы, Мітрафана, Сяргея. К. Магдалены, Кандрата, Якуба.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +16..+18°С | КІЕЎ +27..+29°С | РЫГА +13..+15°С |
| ВІЛЬНЮС +15..+17°С | МАСКВА +21..+23°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°С |

Даты | Падзеі | Людзі

## 1 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

**1836** год — адбылася закладка першага каменя Брэсцкай крэпасці — комплексу абаронных збудаванняў у Брэсце (Брэст-Літоўску). Будавалася па праекце, зацверджаным імператарам Мікалаем I у 1830-м. З першым каменем былі замураваны бронзавая дошка з памятным надпісам і шкатулка з манетамі.

**1883** год — нарадзіўся (Чашнікі) Савелій Міронавіч Рубашоў, хірург, вучоны-медык, арганізатар аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларускай і Малдаўскай ССР. Адзін з заснавальнікаў хірургіі грудной клеткі ў Расіі.



**1911** год — нарадзіўся Якуб Герасімавіч Міско, беларускі пісьменнік, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Удзельнік беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Неаднаразова быў арыштаваны і кінуты ў турму польскімі ўладамі. У 1939-м арыштаваны органамі НКУС (вызвалены ў 1940-м). Творчая спадчына пісьменніка сабрана ў кнізе «Маё маўклівае сэрца».

**1938** год — нарадзіўся Канстанцін Іванавіч Пераліца, акцёр, заслужаны артыст Беларусі. З 1966-га — у Брэсцкім тэатры драмы і музыкі. Выканаўца характэрных і камедыйных роляў.

**1943** год — нарадзіўся Андрэй Георгіевіч Майсёнак, вучоны ў галіне біяхіміі і нутрыцыялогіі. Член-карэспандэнт НАН, доктар біялагічных навук, прафесар. У 1992—1996 гг. — намеснік дырэктара, у 1996 — 1998 гг. — в. а. дырэктара, з 1998-га — загадчык лабараторыі Інстытута біяхіміі НАН Беларусі. Аўтар больш як 160 навуковых прац.

У свеце



**1804** год — нарадзіўся рускі кампазітар Міхаіл Іванавіч Глінка. Яго творы аказалі ўплыў на найбуйнейшых рускіх кампазітараў — Даргамыжскага, Мусаргскага, Рымскага-Корсакава, Барадзіна, Чайкоўскага.

**1862** год — на ўсёй тэрыторыі ЗША забаронена рабства.

**1926** год — нарадзілася Мэрылін Манро, амерыканская кінаактрыса.

**1933** год — нараджэнне Паўночнага флоту СССР. У гэты дзень для абароны паўночных марскіх рубяжоў у сувязі з абвастрэннем міжнароднай абстаноўкі і ўзрослай пагрозай імперыялістычнай агрэсіі супраць СССР была сфарміравана Паўночная ваенная флатылія з месцам базіравання ў Кольскім заліве.

***У гэты ж год*** нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Уладзін, пісьменнік-сатырык, адзін са стваральнікаў 16-й паласы «Літаратурнай газеты» — «Клуба 12 крэслаў».

Так гаварыў...

**МІКАЛАЙ ГУМІЛЁЎ:**

*«Каханне ў лёсе,*
*Як пажар у лесе».*

## УСМІХНЕМСЯ

**На прыёме ў доктара.**

**— Сябруеце з алкаголем?**

**— А чаго мне з ім сварыцца?**

Вовачка чапляецца да бацькі:

— Тата, як працуе мозг?

— Адчапіся, сын, у мяне галава іншым забітая.

**Нездарма заручальны пярсцёнак надзяюць менавіта на той палец, з якога ўсё жыццё бяруць кроў.**

Неўрастэнік — той, хто будуе паветраныя замкі, псіхапат — той, хто ў гэтых замках жыве, а псіхолаг — той, хто спаганяе арэндную плату.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.322. Індэкс 63850. Зак. № 1376.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2023 года.